# БЕЛАРУСКІ РУЧНІК (НА ПРЫКЛАДЗЕ АШМЯНШЧЫНЫ)

УО “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”
**Баркоўская А.А., 1 к., 3 гр., МДФ**
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт Стасевіч М.П.

Важнай састаўной часткай культурнай спадчыны кожнага народа з’яўляюцца этнаграфічныя помнікі. Адно з багатых і старажытных промыслаў беларусаў з’яўляецца народнае ткацтва. Адным з прыкладаў народнага майстэрства з’яўляюцца саматканыя ручнікі.

Мэта маёй работы: паказаць адметнасць беларускай матэрыяльнай культуры на прыкладзе народнага ткацтва ручнікоў на Ашмяншчыны.

Задачы:

- паказаць гісторыю з’яўлення ручнікоў;
- вызначыць асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне ручніка на Ашмяншчыне.

Ручнік – прадаўгаваты кавалак тканіны абрадавага, дэкаратыўнага і ўтылітарнага прызначэння. На Беларусі вядомы з глыбокай старажытнасці, са з’яўленнем ткацтва [1, с. 478].

Канкрэтныя знаходкі ручніка датуюцца перыядам Кіеўскай Русі. Больш дакладныя звесткі звесткі пра беларускі ручнік пакінула Сярэднявечча. Ручнік згадваецца ў дакументах гарадскіх судоў Мінска, Магілёва, Брэста, Гродна, Вільні, Слоніма, Віцебска і іншых гарадоў.

У залежнасці ад прызначэння і функцыі ручнікі маюць розныя назвы. Ручнікі ўтылітарныя паўсюдна на Беларусі называюцца ўціральнік, уцірач, уціркa. Самым высокім статутам надзяляліся абрадавыя, або рытуальныя, ручнікі. Яшчэ адным відам ручнікоў была намітка – своеасаблівы галаўны ўбор беларускіх жанчын. Таксама выдзяляліся аброчныя ручнікі, якія прыносілі на месцы пахавання або ў царкву [2, с. 14-15].

На Ашмяншчыне найбольш распаўсюджаная мясцовая назва тканін – “дымка”. Для арнаменту характэрны буйныя геаметрычныя матывы ў выглядзе кругоў, авалаў, квадратаў, ромбаў. Каларыстычнае вырашэнне ручнікоў традыцыйна двухколернае: белы арнамент на шэральняным ці блакітным фоне. Іншы раз такія ручнікі па канцах дадаткова ўпрыгожаныя вузкімі ўзорыстымі бардзюрамі.

Ручнікі па шырыне бываюць даволі шырокія – 45-52 см, і вузейшыя – 36-43 см. Пры звычайнай даўжыні – 220-260 см. У Ашмянскім раёне сустракаюцца шырокія і кароткія вясельныя ручнікі, прызначаныя для перавязвання сватоў, даўжыня іх – 50-180 см. Ручнікі праваслаўнага насельніцтва, якія выкарыстоўваліся для святочнага ўбрання покуці ці



Рэпазіторый ГрДМУ

ахвяраваліся для царквы, больш доўгія – да 350 см, пры шырыні палатна 48 см [3, с. 677-678].

Для нашай мясцовасці характэрны чыста белыя ручнікі, аздобленыя толькі карункамі. Ручнікі канца XIX – першай паловы XX нярэдка сціпла аздоблены па канцах. У другой палове XX стагоддзя вышываны дэкор белых ручнікоў пераўтварыўся ў тканы. З 1920-ых гадоў для вырабу ручнікоў шырока ўжываецца натуральны шоўк ва ўтку, з 1970-ых гадоў – сінтэтычныя ніткі, блізкія па якасці да шоўку. Гэтыя матэрыялы ў XX стагоддзі ў Панямонні амаль цалкам замянілі традыцыйны лён.

Каларыстычнае вырашэнне ручнікоў традыцыйна двухколернае: белы арнамент на шэра-льняным ці блакітным фоне. Іншы раз такія ручнікі па канцах дадаткова ўпрыгожаныя вузкімі ўзорыстымі бардзюрамі, якія патыканы чырвонымі і чорнымі ніткамі. Выкананы ручнікі пераважна з ільняных нітак [3, с. 677-678].

У архаічных арнаментальных ізводах беларускіх ручнікоў пануе ўмоўна-сімвалічная мова геаметрычнага арнаменту. Ен звязваецца з аграрнай сімволікай і магіяй. У адрозненні ад суседніх этнасаў – рускіх і украінцаў, беларусам не ўласцівы сюжэтна-выяўленчыя кампазіцыі. Характэрным матывам арнаментыкі, асабліва ручнікоў, што паходзяць з Панямоння, а таксама з Ашмяншчыны, з’яўляецца роўнаканцовы крыж, упісаны ў ромб, які спалучае ў сабе дахрысціянскі сімвал распаўсюджання дабра на ўсе бакі свету і хрысціянскую выяву.

Сакральная мова арнаменту з цягам губляла свой першапачатковы сэнс. Традыцыйныя ў мастацкіх адносінах ручнікі заставаліся на Беларусі жывой часткай культуры да сярэдзіны XX стагоддзя. У выніку трансфармацыі эстэтычных густаў і мастацкага ідэалу традыцыйныя ручнікі амаль знікаюць з покуці сялянскай хаты. Але ўсё ж такі з хатняй покуці ручнік зусім не знік, нават наадварот – шмат дзе разам з хрысціянскімі абразамі ён вярнуўся на сваё пачэснае месца. На ім аптымістычна гучыць вясёлка фарбаў, цвітуць разнакаляровыя кветкі, буяюць сакавітыя букеты. [2, с. 15-16]

**Спіс літаратуры:**

1. Беларуская энцыклапедыя: Т. 13: Праміле – Рэлаксін / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – 576 с.

2. Лабачэўская, В.А. Повязь часоў – беларускі ручнік / В.А. Лабачэўская. – Мн.:Беларусь, 2002. – 231 с.

3.Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Т.3. Гродзенскае Панямонне. Кн.2 / агул. рэд. Т.Б.Варфаламеева. – Мінск: Выш. шк., 2006. – 736 с.

Рэпазіторый ГрДМУ